Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №7, 2024-07-31



УДК [929.522:930.25] (476)+(470+571)

**Вадзім УРУБЛЕЎСКІ**



*Загадчык аддзела даследавання рукапісаў Цэнтра даследаванняў старадрукаў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: генеалогія, гістарычная антрапаніміка, рэгіянальная гісторыя, гісторыя штодзённасці, архівазнаўства, крыніцазнаўства.*
*Аўтар каля 100 навуковых артыкулаў.*

# РАДАВОД АЛЕНЫ МАЗАНІК *у святле архіўных крыніц*

**Адным з прыярытэтных напрамкаў беларускай генеалогіі з'яўляецца аналіз радаводаў беларускіх дзеячаў навукі, культуры і грамадска-палітычнай сферы. Аўтарам ужо праводзіліся даследаванні, прысвечаныя беларускім літаратарам. Вывучэнне радаводу асобы з ганаровым званнем Героя Савецкага Саюза ажыццяўляецца намі ўпершыню.**

**Ключавыя словы:** *генеалогія, радавод, Алена Мазанік, метрычныя кнігі, рэвізскія сказкі, пасямейныя спісы, спісы гаспадароў*



Алена Рыгораўна Мазанік (1914—1996) — асоба, чый лёс змяніўся ў лічаныя дні верасня 1943 г. Яна стала ўвасабленнем народнай помсты, жывой легендай падпольнага і партызанскага супраціўлення ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1952—1960-я гг. яна працавала намеснікам дырэктара Фундаментальнай бібліятэкі Акадэміі навук БССР (цяпер Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі). З'яўлялася заслужаным работнікам культуры БССР.

Гераіня нашага даследавання нарадзілася 22 сакавіка (4 красавіка) 1914 г. Як яна сама адзначала ў аўтабіяграфіі, месца яе нараджэння — в. Пасекі Блужскага сельсавета Пухавіцкага раёна [2, арк. 69]. Пасекі — гэта дадатковая назва ўрочышча, затым хутарскога пасялення і вёскі Паддзягцярня*. Менавіта такі тапонім традыцыйна фігуруе ў якасці месца нараджэння А.Р.Мазанік. Урочышча з назвай у форме Паддзягцярна ўпершыню згадваецца ў складзе маёнтка Блужа ў 1899 г. [12]. На той час яно належала да Пухавіцкай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні. Відавочна, што сям'я Мазанікаў была перасяленчай з іншай мясцовасці. Гэты факт ускладняе даследаванне, фарміруючы пошукавую інтрыгу, звязаную з генеалагічнай задачай высвятлення месца паходжання.

Дадзенае даследаванне будуецца на матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (матэрыялы другой паловы XVIII ст. — 1917 г.), Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (1920—1939 гг.), а таксама на асобных удакладняючых матэрыялах з фондаў Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва і Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва.

* Магчыма, на нейкім этапе Пасекі вылучаліся ў асобны населены пункт, але дадзеных аб гэтым няма (*заўв. аўт.*).



Вадзім Урублеўскі. Радавод Алены Мазанік у святле архіўных крыніц

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №7, 2024-07-31



Складанасці ўзнікаюць у сувязі з незахаванасцю метрычных кніг праваслаўных цэркваў па тэрыторыі Пухавіцкага раёна за 1866—1917 гг. (матэрыялы раённага загса загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны), пасямейных і прызыўных спісаў са справаводства Пухавіцкага валаснога праўлення Ігуменскага павета за 1874—1914 гг. (іх лёс мог быць звязаны з макулатурнымі кампаніямі ў БССР у міжваенны перыяд).

Перадусім звернемся да матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Матэрыялы, якія знаходзяцца ў партыйным фондзе № 4, змяшчаюць аўтабіяграфію Алены Мазанік, анкетны ліст на яе як на афіцыянтку і прачку сталовай ЦК КПБ, а таксама дзве ідэнтычныя фотакарткі. Аўтабіяграфія і анкетны ліст датуюцца 7 снежня 1939 г. [2, арк. 69—72 адв.].

Акрамя месца нараджэння, у аўтабіяграфіі Мазанік згадвала аб працоўнай дзейнасці ў 1929—1939 гг. Так, з пятнаццацігадовага ўзросту яна працавала ў Мінску хатняй работніцай. У 1930 г. паступіла на працу ў сталовую Савета Народных Камісараў, дзе працавала да 1935 г. У 1931 г. Мазанік уступіла ў шэрагі Ленінскага Камуністычнага саюза моладзі (ЛКСМ). У 1936 г. перайшла на працу ў дом адпачынку "Сляпянка" [2, арк. 72 адв.]. У 1939 г. пачала працаваць у сталовай Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі. Дадатковыя біяграфічныя звесткі падае анкетны ліст, дзе Мазанік пазначае свой адукацыйны ўзровень — пяць груп школьнай асветы [2, арк. 71].

Інфармацыйны патэнцыял анкетнага ліста, акрамя біяграфічнай плоскасці, да якой можна аднесці прафесію, адукацыю, факты біяграфіі, таксама вымяраецца наяўнасцю звестак пра сямейны стан. Мужам адзначаны Б.А.Тарлецкі, член ЛКСМ, шафёр Мінскага абкама партыі, сын сялян з-пад Лагойска, якія на момант складання анкеты працавалі ў калгасе Прудзішчанскага сельсавета Лагойскага раёна [2, арк. 72]. У дачыненні да генеалогіі гераіні даследавання прыярытэтнай з'яўляецца адпаведная інфармацыя пра яе бацькоў.

Бацькі Алены Мазанік пазначаны ў анкетным лісце з прозвішчамі і ініцыяламі — Мазанік Г.І. (Грыгорый ці Рыгор Іванавіч) і Ерамейчык А.Ц. (Алена Цімафееўна). Бацька названы ўраджэнцам Блужскага сельсавета Пухавіцкага раёна, а маці — Балоцкага сельсавета таго ж раёна. Адзначана, што бацькі працавалі на гаспадарцы і памерлі



179

| ВОПРОСЫ: | ОТВЕТЫ: | |
|---|---|---|
| 26. Кто из родственников или близких знакомых находится за границей, где и чем занимаются, когда и почему выехали и их адрес. | нет | |
| 27. Имеете ли знакомых или родственников в иностранных миссиях, представительствах или среди иноподданных, их фамилия, имя и отчество. | нет | |
| 28. Родители: | ОТЕЦ | МАТЬ |
| а) Фамилия, имя и отчество (указать девичью фамилию матери). | Мазаник Г. И. | Еремейчик Е. Т. |
| б) Время и место рождения. | Пуховицкий р-н Блужский с/с | Пуховицкий р-н Болоцкий с/с |
| в) Каким владели недвижимым имуществом, когда и где. | нет | никаких |
| г) Чем занимались до революции и после. | на хозяйстве | |
| д) Чем занимаются и где находятся (точный адрес) в настоящее время. | Умерли 1918 г. | |
| 29. Родители жены (мужа): | ОТЕЦ | МАТЬ |
| а) Фамилия, имя, отчество. | Тарлецкий А | Князевская Е. |
| б) Время и место рождения. | Логойск | Логойск |
| в) Сословие и соц. происхождение. | крестьяне | |
| г) Каким владели недвижимым имуществом, когда и где. | нет | |
| д) Чем занимались до революции и после. | на хозяйстве | |
| е) Чем занимаются и где находятся (точный адрес) в настоящее время. | [illegible] Логойский р-н Прудищанский с/с | |
| 30. Фамилия, имя, отчество, партийность, место работы и должность, местожительство Ваших совершеннолетних сестер, братьев, сыновей и дочерей. | Мазаник И. Григорьевич Пуховицкий р-н; Мазаник О. Г. Пуховицкий р-н; Мазаник В. Г. гор. Минск Л. К. С. М. | |
| 31. Ваше местожительство (точный адрес и № телефона). | Пуховицкий р-н Блужский с/с деревня Пасека. | |

*Фрагмент анкетнага ліста на члена ЛКСМ Алену Рыгораўну Мазанік са звесткамі аб сям'і, 1939 г. Крыніца: НАРБ. — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 14443. Арк. 72.*

ў 1918 г. У рэальнасці апошні факт тычыўся толькі бацькі, бо маці Алена Цімафееўна была жывая яшчэ ў канцы 1924 г. Яна як гаспадыня згаданая ў спісах гаспадарак хутарскога пасялення Паддзягцярня Пухавіцкага раёна Мінскай акругі за 01.01.1925 г.*. У сям'і Алены-старэйшай было шэсць чалавек, з якіх пісьменным пазначаны адзін. Мазанікі цераспалосна валодалі палявым надзелам, мелі кабылу, дзве каровы, тры свінні, дзве авечкі. Суседзямі Алены былі браты памерлага мужа — Канстанцін Іванавіч і Віктар Іванавіч Мазанікі (першы быў жанаты і меў дзіця, другі з'яўляўся халастым). Канстанцін, Віктар, Алена Мазанікі і Надзея Іванаўна Баравік, народжаная Мазанік, супольна карысталіся агульнымі коннай малацілкай і веялкай [3, арк. 89]. Магчыма, тэхніка дасталася сям'і ў спадчыну ад бацькоў. У суседнім урочышчы Спічнік гаспадаром названы Антон Сямёнавіч Мазанік [3, арк. 90].

* Афіцыйная дата складання спісаў гаспадарак БССР, у рэальнасці крыніца ўключае дадзеныя на канец 1924 г. (*заўв. аўт.*).



Вадзім Урублеўскі. Радавод Алены Мазанік у святле архіўных крыніц

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №7, 2024-07-31



Алена Цімафееўна Мазанік як галава сям'і згадваецца ў іменным спісе жыхароў урочышча Паддзягцярня Пухавіцкай воласці, якія абслугоўваліся Берлежскім таварыствам спажыўцоў, за 20 лістапада 1920 г. У сям'і налічваецца пяць чалавек, пад якімі маюцца на ўвазе адпаведна гаспадыня і чацвёра яе дзяцей. Па суседстве жыла таксама ўдовая Ядзвіга Мазанік, усе чацвёра сямейнікаў якой былі дарослымі [4, арк. 17]. З гэтага вынікае, што Ядзвіга магла даводзіцца Алене свекрывёю.

Пацвярджэнне гэтаму мы знаходзім у спісах гаспадароў з урочышча Паддзягцярня Пухавіцкай воласці Ігуменскага павета за 1916 г., якія складаліся ў кантэксце правядзення Усерасійскага сельскагаспадарчага перапісу. У гэтым годзе Рыгор Іванавіч Мазанік адзначаецца суседам Ядзвігі Яцкаўны Мазанік, што сведчыць аб блізкіх роднасных сувязях, якія варта ўспрымаць няйначай як сувязь маці (ці мачахі) і сына (ці пасынка) [11, арк. 17]. Больш ранніх гістарычных згадак аб знаходжанні Мазанікаў у Паддзягцярні (Пасеках) намі не адшукана.

*Фрагмент спісу сялянскіх гаспадарак і звесткі аб іх стане па хутарах Паддзягцярня Блужскага сельсавета Пухавіцкага раёна Мінскай акругі, 1925 г. (двор № 17. Сям'я Алены Цімафееўны Мазанік). Крыніца: НАРБ. — Ф. 30. Воп. 2. Спр. 1481. Арк. 89.*



Аднясенне ўрочышча Паддзягцярня да маёнтка Блужа дазваляе нам звярнуць увагу на спісы землеўладальнікаў за 1911 і 1914 гг., апублікаваныя ў "*Мінскіх губернскіх ведамасцях*". У спісах публікаваліся дадзеныя на тых уласнікаў зямлі, хто паводле маёмаснага цэнзу меў права ўдзельнічаць у абранні сваіх прадстаўнікоў у земскія органы кіравання. Сапраўды, па маёнтку Блужа ў абедзвюх крыніцах мы знаходзім імя Івана Сямёнавіча Мазаніка [1, с. 331]. Улічваючы, што ў спісе за 1914 г. маглі капіяваць асобныя дадзеныя з папярэдняга спісу, мы можам зрабіць выснову, што смерць дзеда гераіні адбылася паміж 1911 і 1916 гг., аднак, верагодней, у 1915 — першай палове 1916 г. (перапіс праводзіўся ў маі — ліпені 1916 г.).

Пазначанае ў спісах імя па бацьку — добрая падстава для працягу даследавання, якое тым не менш немагчыма без вызначэння лакацыі паходжання асобы. Ва ўмовах адсутнасці прамых генеалагічных крыніц за 1860—1910-я гг. і шырокага распаўсюджання прозвішча Мазанік у сучасным Пухавіцкім раёне актуалізуецца падключэнне такой крыніцы, якая б сведчыла пра набыццё грашовай пазыкі ў Сялянскага пазямельнага банка ў канцы XIX — пачатку XX ст. Тым больш гэта характэрна для сельскагаспадарчых працэсаў пачатку XX ст., калі перасяленні адбываліся не толькі ў цэнтральныя губерні ці ў суседнія паветы, але і ў бліжэйшую воласць ці ў межах воласці.

Так, сярод матэрыялаў Мінскага аддзялення Сялянскага пазямельнага банка намі была адшуканая пастанова аб куплі Цагельнянскім таварыствам гаспадароў Ігуменскага павета 106 дзесяцін 1800 сажняў зямлі ў маёнтку Падблонь, уласнасці памешчыцы Сафіі Аляксандраўны Макавай, за 24 мая 1901 г. Зямля выкупалася 14 гаспадарамі ва ўрочышчы Цагельня, а менавіта ў яго ўчастках Аступішча, Лабанок, Мачалішча, Станок, у чатыры этапы (агульны кошт — 10 тысяч рублёў). Апошні этап прадугледжваў унясенне 2 тысяч рублёў, якія менавіта і пазычаліся ў Сялянскім пазямельным банку. Да 30 сакавіка 1901 г. сума была пералічаная на рахунак банка, памешчыца прыбрала з зямлі жылы дом, пакінула сялянам гаспадарчыя пабудовы. Фактычна ў канцы мая 13 гаспадароў з вёскі Ізбішча і адзін гаспадар з вёскі Карпілаўка сталі ўласнікамі Цагельні [20]. Цагельня знаходзіцца на паўднёвы ўсход ад вёскі Ізбішча Навасёлкаўскай воласці Ігуменскага павета, у напрамку Паддзягцярні. Іван Сямёнавіч Мазанік з'яўляўся выхадцам з вёскі Ізбішча.



Вадзім Урублеўскі. Радавод Алены Мазанік у святле архіўных крыніц

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №7, 2024-07-31



Геаграфічная прывязка Івана Сяменавіча Мазаніка з Паддзягцярні, а раней з Цагельні, да вёскі Ізбішча правяраецца на падставе дастаткова нечаканай крыніцы інфармацыі — карткі ваеннаслужачага 434-га Чарапавецкага палка Віктара Іванавіча Мазаніка, які 30 снежня 1916 г. вывезены з-пад Рыгі ў шпіталь з рэўматызмам мышцаў [19]. Як адзначана вышэй, Віктар згадваецца ў спісе гаспадароў з Паддзягцярні за 1 студзеня 1925 г. Годам яго нараджэння можна ўмоўна лічыць 1890 г., калі сям'я Мазанікаў сапраўды яшчэ не жыла ў Цагельні, а пражывала ў іншым месцы — у Ізбішчы. Такім чынам, лакацыя паходжання дзеда Алены Мазанік па бацьку выяўлена. Яна знаходзіцца блізка ад цэнтра Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці — горада Мар'іна Горка. Перасяленне сям'і на землі маёнтка Блужа ўмоўна прыпадае на 1901—1911 гг. Вынікае, што землі ў Падблоні былі прададзеныя аднавяскоўцам, аднак аніякіх актаў і пастаноў аб куплі зямлі ў Паддзягцярні Іванам Мазанікам на сённяшні дзень намі не адшукана. Гэта магло адбыцца ўжо без звароту ў банк па пазыку.

Улічваючы факт нараджэння ў Івана і Ядзвігі дзяцей у 1870—1880-я гг., можна заключыць, што Іван заспеў правядзенне X Асноўнай рэвізіі абкладзенага падаткамі насельніцтва Расійскай Імперыі, якая прыпадала на 1857—1858 гг. Адпаведна рэвізская сказка в. Ізбішча, уласнасці Віктара і Антона Антонавічаў Ратынскіх, складзеная 12 лістапада 1857 г., дазваляе нам ідэнтыфікаваць двор продкаў Алены Рыгораўны і вызначыць узрост яе дзеда на момант рэвізіі [16]. Так, 54-гадовы Ігнат Амяллянавіч Мазанік з'яўляўся гаспадаром двара № 13 пасля смерці бацькі Амяллян каля 1855 г. У яго сям'і была жонка Ганна (35 год), дачка Міхаліна (18 г.), сын Сымон (32 г.), нявестка Макрэна (34 г.). У Сымона і Макрэны ўжо было пяць дзяцей: Паладдзя (9 г.), Ева (8 г.), Елісавета (6 г.), Адам (4 г.) і Янка (1,5 г.)*. За працоўную дапамогу з долі гаспадароў у двары пражываў таксама 16-гадовы Сцяпан Альгерчык, пераведзены з в. Загай [16, арк. 88 адв. — 89].

Нягледзячы на адсутнасць метрычных кніг пазней за 1865 г., у межах захаванага комплексу мы знаходзім пяць метрычных запісаў са справаводства Навасёлкаўскай


РЕВИЗСКАЯ СКАЗКА

1857 года Ноября 12 дня Минской губернии Игуменского уезда Деревни Избища

| Семьи. | | Мужескій полъ. | По послѣдней ревизіи состояло и послѣ оной прибыло. | Изъ того числа выбыло. | | Нынѣ на лицо. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № 9 ревизіи | № 10 ревизіи | | Лѣта. | Когда именно. | | Лѣта. |
| | | крестьяне | | | | |
| 13. | 13. | Амельян Степанов Мазаник | 70 | умер 1855 | | |
| | | его сын Игнат | 47 | | | 54 |
| | | Игната сыновья 1. Симон | 25 | | | 32 |
| | | Симона сыновья 1. Адам | новорожден | | | 4 |
| | | 2 Янко | тоже | | | 1/2 |
| | | Игната 2й сын Фома | 8 | умер 1853 | | |
| | | [illegible] Альгерчик | [illegible] №9 | | | 16 |
| 12 | 14 | [illegible] | | [illegible] 1816 | | |

Итого мужескаго пола на лицо 5

*Фрагмент рэвізскай сказкі в. Ізбішча Ігуменскага павета Мінскай губерні, спадчыннай уласнасці Віктара і Антона Антонавічаў Ратынскіх, 1857 г. (двор № 13. Сям'я Ігната Мазаніка, мужчынская частка). Крыніца: НГАБ. — Ф. 333. Воп. 9. Спр. 1020. Арк. 88 адв.*

Пакроўскай праваслаўнай царквы аб хрышчэнні дзяцей Сямёна Ігнатавіча і Макрэны Сямёнаўны Мазанікаў — Елізаветы (1850), Адама (1853), Івана (1856), Антонія (1859), Міхаліны (1863)**. Месцам пражывання бацькоў ва ўсіх чатырох выпадках адзначана Цагельня, тыпалогія якой як населенага пункта, відавочна, была незразумелая самім складальнікам метрычнай кнігі*** [5—9].

* У тэксце артыкула дваранскія і сялянскія імёны па бацьку прыводзяцца ў сучасных формах, хаця ў арыгіналах крыніц яны падаваліся як на сучасны, так і на тагачасны манер — Антонавіч, Сцяпанаў, Сямёнаўна і г. д. (*заўв. аўт.*).

** У рэвізскіх сказках імёны сялян часта пісаліся ў формах бытавання — Сымон, Янка; у канфесійным справаводстве часцей падаваліся кананічныя формы — Сямён, Іван. У дадзеным артыкуле згаданыя формы ўжываюцца ў кантэксце таго віду крыніц, які прыводзіцца (*заўв. аўт.*).

*** Цагельня адзначаецца вёскай (1850), хутарам (1853), засценкам (1856, 1859) і ўрочышчам (1863) (*заўв. аўт.*).



Вадзім Урублеўскі. Радавод Алены Мазанік у святле архіўных крыніц

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №7, 2024-07-31




*Фрагмент рэвізскай сказкі в. Карпілаўка Ігуменскага павета Мінскай губерні, спадчыннай уласнасці Антонія Ігнатавіча Ратынскага, 1811 г. (двор № 41. Сям'я Эмельяна Мазаніка). Крыніца: НГАБ. — Ф. 333. Воп. 9. Спр. 210. Арк. 514 адв. — 515.*

Такім чынам, метрычныя запісы дэталізуюць факты нараджэння трох з пяці дзяцей Сямёна і Макрэны, адзначаных у рэвізскай сказцы. Другая выснова, якая напрошваецца праз параўнанне крыніц, заключаецца ў тым, што Цагельня, паводле метрычных кніг, з'яўляецца асобным населеным пунктам, але ў рэвізіі 1858 г. яна афіцыйна не адзначана.

Некаторую яснасць пра побыт сям'і ў 1860—1890-я гг., а таксама пра дыхатамію "Ізбішча — Цагельня" ўносяць матэрыялы аб адмене прыгоннага права ў маёнтку памешчыцы Сафіі Антонаўны Ратынскай (па мужы Буяноўскай) [18], а з 1870 г. — буйнога чыноўніка Льва Савіча Макава (1830—1883) і яго жонкі Сафіі Аляксандраўны Макавай [10]. Справа з фонду НГАБ "Мінская губернская па сялянскіх справах прысутнасць" уключае дакументы за 1862—1916 гг. і асвятляе дастаткова складаны працэс маёмаснага вызвалення беларускага сялянства ад прыгоннай залежнасці.

Паводле ўстаўной граматы 1862 г. маёнтка Падблонь за селянінам Ігнатам Мазанікам лічыліся адна дзесяціна сядзібнай, 9,5 дзесяціны ворыўнай зямлі, 5 дзесяцін сенажацяў. Усяго — 15,5 дзесяціны [18, арк. 39 адв. — 40]. Адзначалася, што ва ўрочышчы Цагельня маецца адзін сялянскі ўчастак, які мяркуецца перанесці ў в. Ізбішча [18, арк. 35 адв.].

Перанясенне ўчастка ў Ізбішча адбылося толькі праз 10 год. Дамова паміж памешчыкамі Макавымі і Ізбішчанскім таварыствам сялян ад 28 кастрычніка 1871 г. паведамляе, што паводле выкупнога акта ворыўны надзел Мазанікаў складаўся ўжо з 16 дзесяцін 682 сажняў.



Вадзім Урублеўскі. Радавод Алены Мазанік у святле архіўных крыніц

Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №7, 2024-07-31



Згодна з адным з пунктам дамовы сям'я Мазанікаў пакідала Цагельню да 1873 г. і канчаткова перабіралася ў Ізбішча. Да заключэння гэтай дамовы Ігнат Мазанік ужо не дажыў і выканаць абавязацельствы мусіў яго зяць Іван Сянько. Адсутнасць згадак пра Сымона Мазаніка сведчыць аб тым, што ён памёр яшчэ раней за бацьку [18, арк. 119—120]. Такім чынам, калі сям'я Ігната Мазаніка каля 1872 г. пакінула Цагельню, то амаль праз 30 год вярнулася туды ў асобе яго ўнука Івана, ураджэнца якраз гэтага паселішча.

Рэвізскія сказкі канца XVIII — першай паловы XIX ст. падаюць інфармацыю пра склад сям'і Мазанікаў перыяду валодання вёскамі трыма пакаленнямі Ратынскіх. Так, у 1834 г. гаспадаром з'яўляўся Сармат Антонавіч Ратынскі, у 1811 г. — Антоні Ігнатавіч Ратынскі, у 1795 г. — Ігнат Феліцыянавіч Ратынскі.

На 19 красавіка 1834 г. гаспадаром у сям'і быў Амяллян Сцяпанавіч Мазанік (54 год), чыёй жонкай называецца Элена (53 год). Дзецьмі Амялляна былі Ігнат (31 г.), Базыль (19 г.), Тэрэса (17 г.), Янка (13 г.), Сыльвестр (10 г.). У Ігната ўжо мелася свая сям'я, якая складалася з жонкі Ганны (28 г.), сыноў Сымона (9 г.) і Міхала (5 г.) [14, арк. 758 адв.]. Сымон — прадзед Алены Мазанік.

У 1811 г. даследаваная сям'я Мазанікаў у Ізбішчы яшчэ не пражывала [15, арк. 531—532]. На 30 верасня гэтага года месцам пражывання сям'і пазначана в. Карпілаўка. У гэтай рэвізіі згаданыя толькі мужчыны, якіх сярод прадстаўнікоў вывучаемай галіны на гэты час было толькі двое — Амяллян (у крыніцы — Эмельян) Сцяпанавіч Мазанік (33 г.) і яго сын Ігнат (8 г.). Абодва называюцца прапушчанымі па папярэдняй рэвізіі 1795 г. [15, арк. 515].

*Самай ранняй крыніцай па дадзенай тэме з'яўляецца спіс парафіянаў Навасёлкаўскай Ануфрыеўскай грэка-каталіцкай царквы за 30 мая 1766 г. Царква на той час знаходзілася пад апекай мінскага лоўчага Антонія з Козарава Барэцкага, старасты крывасельскага і марозавіцкага. У склад парафіі ўваходзілі ўласна Навасёлкі (77 двароў), Пудзіцк (64 двары), Сінча (23 двары), Любячка (13 двароў), Амельна (36 двароў), Клетна (18 двароў), Ігнатаўка (11 двароў), Дубовая Слабада (16 двароў), Баравая (29 двароў) [17, арк. 123—127]. Іван Мазанік пражываў у в. Ігнатаўка; Васіль і Барыс Мазанікі — у вёсцы Дубовая Слабада; Даніла, Іван і Навум Мазанікі — у в. Баравая [17, арк. 126—126 адв.]. На жаль, імя па бацьку Сцяпана Мазаніка, якія не дажыў да рэвізіі 1795 г., нам невядома, таму нельга сказаць, чым сынам ён з'яўляўся і адпаведна з якой вёскі паходзіў. Радавод Алены Мазанік углыб, такім чынам, прыпыняецца на сёмым пакаленні і на сярэдзіне XVIII ст.*




*Літара N — невядомае дзявочае прозвішча жанчыны.

У радаводзе падкрэслены мужчыны па прамой лініі Алены Мазанік.



Вадзім Урублеўскі. Радавод Алены Мазанік у святле архіўных крыніц

***Віншую шаноўную рэдакцыю "Беларускага гістарычнага часопіса" з выданнем юбілейнага, 300 нумара! Доўгія гады часопіс застаецца знакавай часткай інтэлектуальнай прасторы і гуманітарнага сегменту ведаў у Беларусі. На яго старонках знаходзяць адлюстраванне значныя навуковыя і асветніцкія сюжэты, якія спрыяюць светапогляднаму фарміраванню як юнака-пачаткоўца, так і прафесіянала. Прыемна адзначаць нарастальную актуальнасць на старонках часопіса сюжэтаў, звязаных з гістарычнымі асобамі і іх унёскам у гісторыю Беларусі. Дзякуй за прафесійную апрацоўку аўтарскіх матэрыялаў, змястоўнае напаўненне рубрык, назапашванне вопыту вывучэння і выкладання гісторыі!***

***Вадзім УРУБЛЕЎСКІ***

Першая для Мінскай губерні, а афіцыйна V Рэвізская сказка, была праведзена ў вёсках Ратынскіх 20 верасня 1795 г. Карпілаўка праходзіць тут пад назвай Навасёлкі (з такой назвай населены пункт часцей фігуруе ў дакументах). На той час вёску арандавала Ганна Тамашоўна Бурынская. На жаль, пропуск сям'і ў рэвізіі не дае матэрыялу да далейшай аналітыкі [13]. Верагодней за ўсё, бацька Амяляна — Сцяпан — памёр да 1795 г.

У якасці крыніцазнаўчых асаблівасцяў рэвізскіх сказак трэба адзначыць умоўнасць дат смерці, а таксама выніковасці арыфметычнага дзеяння па вызначэнні году нараджэння шляхам вылічэння ўзросту ад даты, пад якой асоба згаданая ў дакуменце. Рэвізскія сказкі складаліся адміністрацыяй маёнткаў у адпаведнасці з дакументацыяй маёнткаў, не звяраліся з царкоўнымі метрыкамі, таму ў выніку патрэбы даты прыводзіліся па памяці. З-за гэтага без суцэльнай апрацоўкі захаваных метрычных кніг, ранейшых за 1866 г., мы не можам дакладна высветліць даты жыцця старэйшых пакаленняў роду. Аднак умоўныя даты прапанаваць рэальна: Сымон Ігнатавіч (каля 1825 — паміж 1865 і 1871), Ігнат Амяллянавіч (каля 1803 — каля 1871), Амяллян Сцяпанавіч (каля 1778 — каля 1855).

Праведзенае даследаванне з'яўляецца класічным у дачыненні да тэрыторыі Ігуменскага павета Мінскай губерні, бо змяшчае стандартныя пошукавыя праблемы, звязаныя з працэсамі перасялення, незахаванасцю комплексу метрычных кніг і матэрыялаў загса 1866—1941 гг. Аднак у цэлым пошукавыя цяжкасці паспяхова пераадольваюцца, што можа быць прыкладам і стымулам для аналагічных даследаванняў (*гл. схему на с. 28*).

Геаграфія пражывання сям'і Мазанікаў з сярэдзіны XVIII ст. да другой трэці XX ст. ахоплівала тэрыторыю маёнтка Навасёлкі, які ўяўляў сабой невялікую лакацыю ў межах сучаснага Пухавіцкага раёна. Дынаміка руху зводзілася да наступных населеных пунктаў: Навасёлкі-Карпілаўка (другая палова XVIII — пачатак XIX ст.) — Ізбішча (пачатак XIX ст. — 1840-я гг.) — Цагельня (1840-я — 1872) — Ізбішча (1872—1901) — Цагельня (1901—1911?) — Паддзягцярня-Пасекі (з 1911?).

Сярэдняя працягласць жыцця прадстаўнікоў шасці мужчынскіх пакаленняў па прамой лініі, пачынаючы з бацькі Алены Мазанік, складае з улікам усіх умоўнасцяў дат нараджэння 55,5 года, што з'яўляецца дастаткова невысокім паказчыкам ва ўмовах мірнага часу. Яшчэ прыкладна шэсць пакаленняў аддзяляюць першага вядомага па імені прадстаўніка галіны Сцяпана Мазаніка ад умоўнага родапачынальніка, чыя жыццядзейнасць прыпадае на другую палову XVI — пачатак XVII ст., той перыяд, калі адбываўся працэс фарміравання сялянскіх прозвішчаў на тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі, у прыватнасці Менскага ваяводства.

Адзначым перспектыўнасць для назапашвання дадатковых дадзеных па генеалогіі Мазанікаў такога напрамку, як даследаванне інвентароў XVIII ст. — гаспадарчых апісанняў прыватнаўласніцкіх маёнткаў са звесткамі генеалагічнага характару на сялян. У прыватнасці, у НГАБ на захаванні маюцца інвентары маёнтка Навасёлкі за 27 красавіка 1744 г. і 3 верасня 1791 г. У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захоўваецца інвентар ад 31 ліпеня 1792 г. [21, с. 505]. Таксама прапрацоўка метрычных кніг Навасёлкаўскай Ануфрыеўскай грэка-каталіцкай царквы (з 1839 г. Навасёлкаўскай Пакроўскай праваслаўнай царквы) за 1797—1865 гг. з НГАБ тэарэтычна дапаможа ўдакладніць і дэталізаваць асобныя даты па нараджэннях, шлюбах і смярцях прадстаўнікоў роду гераіні.

---


1. Дрозд, Д. М. Землевладельцы Минской губернии, 1900—1917 : справочник / Д. М. Дрозд. — Минск : Медисонт, 2013. — 694 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 14443.
3. НАРБ. — Ф. 30. Воп. 2. Спр. 1481.
4. НАРБ. — Ф. 332. Воп. 1. Спр. 671.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 136. Воп. 13. Спр. 275. Арк. 14 адв. — 15.
6. НГАБ. — Ф. 136. Воп. 13. Спр. 285. Арк. 1476 адв. — 1477.
7. НГАБ. — Ф. 136. Воп. 13. Спр. 296. Арк. 142 адв. — 144.
8. НГАБ. — Ф. 136. Воп. 14. Спр. 298д. Арк. 64 адв. — 65.
9. НГАБ. — Ф. 136. Воп. 14. Спр. 323. Арк. 84 адв. — 85.
10. НГАБ. — Ф. 147. Воп. 3. Спр. 5278.
11. НГАБ. — Ф. 325. Воп. 2. Спр. 223.
12. НГАБ. — Ф. 333. Воп. 4. Спр. 9231.
13. НГАБ. — Ф. 333. Воп. 9. Спр. 37. Арк. 145—188.
14. НГАБ. — Ф. 333. Воп. 9. Спр. 126. Арк. 754—760.
15. НГАБ. — Ф. 333. Воп. 9. Спр. 210. Арк. 511—515, 531—532.
16. НГАБ. — Ф. 333. Воп. 9. Спр. 1020. Арк. 84 адв. — 91.
17. НГАБ. — Ф. 1502. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 123—127.
18. НГАБ. — Ф. 1595. Воп. 2. Спр. 1547.
19. Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў (РДВГА). — Картатэка бюро ўліку стратаў у Першай сусветнай вайне. — Скрынка 2073-М. — Картка № 1194.
20. РДГА. — Ф. 592. Воп. 18. Спр. 1155.
21. Спрогис, И. Я. Географический указатель выборных документов из актовых книг Виленского центрального архива / И. Я. Спрогис. — Т. 2—3 // На правах рукапісу (бібліятэка НГАБ). — 1691 с.


*Паступіў у рэдакцыю 29.05.2024.*